**УДК 340.12«15/16»**

# КАНЦЭПЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНА-ПАЛІТЫЧНАГА ЎЛАДКАВАННЯ Ў ТВОРАХ АНДРЭЯ ВОЛАНА

***канд. філас. навук, дац. І.А. БОРТНІК, А.А. ЕМЯЛЬЯНАЎ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца праблема дзяржаўна-палітычнага ўладкавання ў творах выбітнага прадстаўніка грамадска-палітычнай думкі Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. Андрэя Волана. Разгледжана гістарыяграфія праблемы, вызначаны яе асноўныя дасягненні і недахопы. Выяўлена сувязь ідэй А. Волана з тэарэтычна-катэгарыяльнай сістэмай, выпрацаванай у еўрапейскай грамадска-палітычнай думцы эпохі Рэнесансу. Адзначаецца, што ў творах А. Волана змяшчаліся канцэпцыя дзяржавы і права як умовы грамадзянскай свабоды, канцэпцыя станавага падзелу грамадства з прызнаннем адноснай фармальна-прававой роўнасці прадстаўнікоў усіх станаў, канцэпцыя шляхецтва, акцэнтаваная маральна-інтэлектуальнымі сентэнцыямі. Пры разглядзе пытання формы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання ў творах А. Волана змяшчаецца ў цэлым апалагетычнае стаўленне да палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай з падкрэсліваннем асаблівага статусу арыстакратычнай эліты. Характэрнай рысай выступае істотна выражаная інтэлектуалісцкая і прафесіяналісцкая трактоўка арыстакратыі.*

**Уводзіны**. Другая палова XVI – пачатак XVII стст. – час канцэптуальнага станаўлення грамадска-палітычнай думкі ў Вялікім Княстве Літоўскім, якая ўключала ў сябе актуалізацыю праблемы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання грамадства. Дадзены працэс быў выкліканы актывізацыяй сацыяльна-палітычнага жыцця, рэфармаваннем заканадаўства і палітычных інстытутаў у ВКЛ, Рэфармацыяй, распаўсюджаннем адукаванасці і інтэнсіфікацыяй культурных кантактаў з іншымі еўрапейскімі краінамі.

Адной з найбольш выбітных постацяў грамадска-палітычнай, а таксама тэалагічнай думкі ВКЛ другой паловы XVI – пачатку XVII стст. з'яўляецца Андрэй Волан, які вядомы як дзяржаўны, грамадска-палітычны і рэлігійны дзеяч ВКЛ.

Аб'ектам даследавання ў дадзеным артыкуле выступаюць працы А. Волана, прысвечаныя грамадска-палітычнай тэматыцы: "Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе" (1572) [1], "Прамова да Сената Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага" (1573) [2], "Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці" (1608) [3]. Прадметам даследавання выступаюць ідэі, змешчаныя ў дадзеных творах адносна праблемы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання. Адпаведна мэта прадстаўленага артыкула – тэарэтычная рэканструкцыя ідэй А. Волана аб дзяржаўна-палітычным уладкаванні грамадства.

Творчасць Андрэя Волана з'яўляецца дастаткова добра даследаванай у навуковай літаратуры ў параўнанні з іншымі прадстаўнікамі грамадска-палітычнай думкі ВКЛ другой паловы XVI – першай паловы XVII стст. Пачатак даследавання быў пакладзены ў польскай гістарыяграфіі XIX ст. працай М. Баліньскага, дзе, праўда, істотнага аналізу сацыяльна-палітычнай канцэпцыі А. Волана праведзена не было [4]. На пачатку XX ст. кароткі нарыс жыцця і дзейнасці А. Волана быў прадстаўлены ў даследаванні О. Курнатоўскага [5]. На працягу XX ст. грамадска-палітычныя элементы творчасці А. Волана станавілася прадметам даследавання такіх польскіх навукоўцаў як Э. Ярра (агульны агляд сацыяльна-палітычных поглядаў А. Волана) [6, s. 148–155], А. Кэмпфі (параўнальны аналіз творчай спадчыны А. Фрыча Маджэўскага і А. Волана) [7] і інш.

Асаблівая ўвага павінна быць нададзена беларускай гістарыяграфіі, дзе творчасць А. Волана сатнавілася прадметам даследавання ў працах С.Ф. Сокала [8; 9], С.А. Падокшына [10; 11], І.В. Саверчанкі [12, с. 59–68; 13, с. 197–200, 212–215], А.А. Падалінскай [14, с. 196–203].

Асаблівую ўвагу заслугоўваюць манаграфічныя даследаванні С.Ф. Сокала і С.А. Падокшына, дзе даволі разгорнута прадстаўлены сацыяльна-палітычныя погляды А. Волана.

С.Ф. Сокал у сваіх творах адзначаў наяўнасць у грамадска-палітычнай канцэпцыі А. Волана элементаў тэорыі натуральнага права і грамадскага дагавору. Ён грунтоўна вызначыў і даследаваў у межах названай канцэпцыі спецыфіку паняццяў "свабода" і "няволя" ў кантэксце натуральнага права, разуменне свабоды як феномена, рэалізацыя якога магчымая толькі ў прававых умовах, узаемасувязь натуральнага і дзяржаўнага права, характарыстыкі дзяржаўнага права, судаводства, мадэль станавай структуры грамадства [9, с. 73–98]. С.Ф. Сокал высунуў гіпотэзу, у адпаведнасці з якой логіка разважанняў А. Волана ўказвае на прызнанне існавання дадзяржаўнага стану, у межах якога кожны індывід цалкам карыстаўся сваімі натуральнымі правамі, і паходжанне дзяржавы ў выніку з'яўлення пагрозы для рэалізацыі індывідамі гэтых натуральных правоў [9, с. 74-75]. С.Ф. Сокалам акцэнтуецца ўвага на ідэі прававой роўнасці ўсіх грамадзян, якая вынікае з натуральнага права, і на ролі асабістых заслуг для атрымання шляхецтва. Падкрэслівалася, што ў разуменні А. Волана адрозненні паміж станамі вынікаюць

перадусім з розных сацыяльных функцый, неабходных для дасягнення агульнага дабра ў грамадстве, якія не адмяняюць юрыдычнай роўнасці [9, с. 80–84].

У даследаванні С.А. Падокшына "Філасофская думка эпохі Адраджэння" [11] праведзены вельмі грунтоўны аналіз сацыяльна-палітычнай канцэпцыі А. Волана, перадусім на аснове працы "Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе". У гэтым даследаванні былі вызначаны наступныя элементы канцэпцыі А. Волана:

– ідэя прававой дзяржавы;
– ідэя свабоды як недатыкальнасці асобы і ўласнасці;
– дыялектычнае разуменне ўзаемасувязі свабоды і няволі;
– ідэя аб спалучэнні традыцыйнай станавай структуры грамадства (шляхта, мяшчанства, сялянства) з адноснай юрыдычнай роўнасцю прадстаўнікоў усіх станаў на аснове арыстоцелеўскай канцэпцыі аб дыстрыбутыўнай і камутатыўнай справядлівасці;
– ідэя натуральнага права як крыніцы дзяржаўнага права;
– ідэя грамадскай згоды як адлюстравання фармальна-прававой справядлівасці;
– стыхійна-дыялектычнае і гуманістычнае разуменне заканадаўства;
– ідэя асвечанай манархіі, абмежаванай разумнымі і справядлівымі законамі;
– ідэя аб імкненні да маральнай і інтэлектуальнай дасканаласці прадстаўнікоў дзяржаўнай улады [11, с. 204–226].

С.А. Падокшын зрабіў выснову аб наяўнасці ў канцэпцыі А. Волана элементаў рэненсансна-гуманістычнага натуралізму і раннебуржуазнага юрыдычнага светапогляду. На яго думку, А. Волан з'яўляўся выразнікам інтарэсаў адукаванай і гуманістычна настроенай шляхты, якая імкнулася да рэфармавання заканадаўства і дзяржаўных інстытутаў у ВКЛ (мелася на ўвазе кола паплечнікаў полацкага ваяводы Мікалая Дарагастайскага, якое ініцыіравала рэформы заканадаўства і суда ў ВКЛ у 1580-я гг.). Але пры гэтым адзначалася, што ў некаторых выпадках, напрыклад, пры разглядзе канкрэтных пытанняў права ў воланаўскай канцэпцыі праяўлялася дэмакратычная тэндэнцыя да прызнання прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцяў [11, с. 215, 221, 226]. У адрозненне ад С.Ф. Сокала, С.А. Падокшын выразна падкрэсліваў адносны характар ідэі юрыдычнай роўнасці ў канцэпцыі А. Волана і непрыняцце ў яе межах ідэі сацыяльнай роўнасці [11, с. 210].

Неабходна адзначыць, што на працы як С.Ф. Сокала, так і С.А. Падокшына вялікі адбітак мела пануючая ў савецкія часы марксісцка-ленінская метадалогія.

У позніх працах С. Падокшына, змешчаных у зборніку "Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры", мела месца спроба пераасэнсавання творчасці А. Волана з новых пазіцый. Вялікае значэнне мелі ўвядзенне ў навуковы зварот і аналіз працы "Прамова да Сената" [10, с. 167–173]. Але разам з тым адыход ад марксісцка-ленінскай метадалогіі суправаджаўся неабгрунтаваным выкарыстаннем мадэрнісцкай трактоўкі творчай спадчыны А. Волана, гэтаксама як і іншых прадстаўнікоў грамадска-палітычнай думкі ВКЛ XVI–XVII стст. Так, у адным выпадку ідэі А. Волана аб грамадскай згодзе і суадносінах свабоды і няволі разглядаюцца як праява ліберальна-дэмакратычнай традыцыі ў сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ, як тэарэтычныя вытокі ліберальнай дэмакратыі XVIII ст. [10, с. 149]. У іншым выпадку, пры разглядзе твора "Прамова да Сената" ідэі А. Волана інтэрпрэтуюцца як "прагрэсіўны шляхецкі неакансерватызм", які прадугледжваў спалучэнне "ліберальных" гуманістычных каштоўнасцяў з моцнай манархічнай уладай, абмежаванай законам і прадстаўнічымі шляхецкімі інстытутамі [10, с. 169].

**Асноўная частка**. Ідэі А. Волана аб дзяржаўна-палітычным уладкаванні грамадства вынікаюць перадусім з распаўсюджаных у еўрапейскім дыскурсе позняга Сярэднявечча і Рэнесансу антычных тэорый Платона, Арыстоцеля, Цыцэрона, на што розныя даследчыкі ўжо звярталі ўвагу. Сутнасць чалавечага грамадства, аб'яднанага дзяржаўнымі інстытутамі, у адпаведнасці з гэтым бачыцца ў тым, каб "забяспечыць спакойнае, мірнае жыццё, свабоднае звадаў і варожай пагрозы" [1, с. 5]. У духу арыстацелізму А. Волан сцвярджае, што "ўсякая чалавечая супольнасць, называная грамадствам, утвараецца дзеля таго, каб людзі праз агульнае паразуменне і ўзаемную падтрымку жылі памысна і шчасліва" [1, с. 20].

Асновай сацыяльных сувязяў і ўзаемаадносін выступае натуральнае права, што абапіраецца на натуральны розум, для якога характэрныя імкненне да свабоды, разуменне дабра і справядлівасці [1, с. 12, 26–28, 47, 61]. Але ў той жа час без дзяржаўна-прававых інстытутаў патрабаванні натуральнага права не могуць быць рэалізаваныя праз натуральныя жарсці людзей (самавольства, славалюбства, сквапнасць): "Ніякую супольнасць людзей, якая не мае законаў і дзе кожны робіць, што хоча, нельга назваць сапраўдным чалавечым грамадствам. Такая супольнасць будзе нагадваць хутчэй зборышча хіжых звяроў. Толькі ў звярыным асяродку мацнейшы перамагае слабейшага і тым забяспечвае сваё існаванне" [1, с. 62-63]. Такая характарыстыка "бездзяржаўнага існавання" людзей не з'яўляецца, аднак, цвёрдым доказам таго, з'яўляўся А. Волан прыхільнікам дагаварной або арыстоцелеўскай патрыярхальнай тэорыі паходжання дзяржавы.

Формай рэалізацыі натуральнага права ў грамадстве разглядаецца афіцыйнае дзяржаўнае права. Наяўнасць законаў па сутнасці канстытуіруе дзяржаву. Галоўнай мэтай дзяржаўнага права абвяшчаецца забеспячэнне грамадзянскай свабоды, пад чым разумееца стварэнне гарантый недатыкальнасці асобы і яе ўласнасці, без чаго немагчымае чалавечае шчасце [1, с. 19–21, 26]. Пры гэтым сапраўдная свабода магчымая толькі там, дзе дзяржаўнае права адпавядае важнейшым этыка-палітычным каштоўнасцям, што вынікаюць з натуральнага розуму – дабру, справядлівасці, памяркоўнасці [1, с. 26–28]. У гэтым выпадку ў грамадстве ўсталёўваецца згода, якая разглядаецца як яшчэ адна важнейшая каштоўнасць у грамадска-палітычнай думцы даследуемага перыяду [1, с. 32].

Адной з важнейшых праблем дзяржаўна-палітычнага ўладкавання ў творы А. Волана “Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе” выступае пытанне прававога замацавання ўзаемаадносін паміж рознымі станамі для дасягнення справядлівасці і агульнага дабра, якое, трэба адзначыць, было даволі грунтоўна разгледжана ў навуковай літаратуры [9, с. 81–88; 11, с. 209–215]. А. Волан вылучае тры грамадскія станы – шляхту, мяшчанства і сялянства – і вызначае іх асноўныя сацыяльныя функцыі. Для шляхты галоўнай функцыяй абвяшчаецца вайсковая абарона дзяржавы, для мяшчанства – рамесная і гандлёвая дзейнасць, для сялянства – сельскагаспадарчая праца [1, с. 29-30]. Такі станавы падзел грамадства абвяшчаецца асновай грамадскай стабільнасці і адлюстраваннем натуральнага права, з якога вынікае сфармуляваная Арыстоцелем дыстрыбутыўная справядлівасць, што прадугледжвае захаванне адзінства пры выкананні рознымі часткамі грамадства розных функцый [1, с. 32]. Дыстрыбутыўная справядлівасць прадугледжвае палітыка-прававую няроўнасць прадстаўнікоў розных станаў. Так, А. Волан лічыць непахіснымі ўсе шляхецкія прывілеі, манапольныя правы шляхты на ўдзел у кіраванні дзяржавай [1, с. 30]. Праўда, пры гэтым падкрэслівалася неабходнасць усіх шляхціцаў выконваць абавязкі, якія вынікаюць з іх станавага статусу, недапушчальнасць займацца рамяством і гандлем [1, с. 45].

Разам з тым, у адпаведнасці з прынцыпам камутатыўнай справядлівасці, якая прадугледжвае ўсеагульную роўнасць, А. Волан адстойвае прынцып роўнасці прадстаўнікоў усіх станаў перад законам за здзейсненыя парушэнні права. Занядбанне гэтага прынцыпу прыводзіць, на яго думку, да канфліктнасці ў адносінах паміж станамі і, такім чынам, разбурэння грамадскай згоды. У якасці прыкладу ілюструюцца падзеі ў Лівоніі падчас Інфлянцкай вайны, у якой прыгнечанае сялянства аказвала падтрымку знешнім ворагам дзяржавы. У гэтай сувязі А. Волан выступаў за забеспячэнне ў заканадаўстве і судовай практыцы ВКЛ адноснай фармальна-прававой роўнасці ўсіх грамадзян, дазвол прадстаўнікам ніжэйшых станаў падаваць скаргі на шляхту. Такая сістэма прававых узаемаадносін паміж станамі, на яго думку, існавала ў Венецыянскай Рэспубліцы, якая разглядаецца як ідэал грамадска-палітычнага ўладкавання [1, с. 34]. Характэрна, што погляды А. Волана на станавы падзел грамадства маюць шмат агульнага з поглядамі буйнейшага польскага прадстаўніка сацыяльна-філасофскай думкі сярэдзіны XVI ст. А.Ф. Маджэўскага [7, с. 203–218]. Можна пагадзіцца з С.А. Падокшыным, што А. Волан быў праціўнікам сацыяльнай роўнасці (больш за тое ён лічыў няроўнасць станаў адпаведнай натуральнаму розуму) і прыхільнікам абмежаванай фармальна-прававой роўнасці прадстаўнікоў усіх станаў [11, с. 210–215].

Палітыка-прававы статус мяшчанства і сялянства разглядаецца А. Воланам вельмі абстрактна. Затое шмат увагі надаецца вызначэнню прававых падстаў для фарміравання пануючага стану – шляхты. Адзначаецца, што шляхецтва можа ўзнікаць натуральным шляхам у выніку асаблівых якасцяў асобных выбітных людзей [1, с. 43–44]. Разам з тым падкрэсліваецца, што ў рэчаіснасці пачынальнікамі шляхецкіх родаў часта станавіліся і выпадковыя людзі [1, с. 35]. А. Волан вылучае ў сучасным грамадстве радавітае і дароўнае шляхецтва. Ён высока ацэньвае той шляхецкі статус, які становіцца вынікам рэалізацыі асабістых інтэлектуальных і валявых намаганняў (шматразова ўзгадваецца прыклад старажытнарымскага палкаводца Марыя, які, будучы выхадцам з сацыяльных нізоў, дасягнуў значнага грамадскага аўтарытэту, дзякуючы сваім асабістым якасцям), указваючы канкрэтныя прыклады, абвяргае ідэю аб аўтаматычным пераходзе высакародных якасцяў шляхетных продкаў на нашчадкаў і ў сувязі з гэтым падкрэслівае неабходнасць радавітай шляхты сваімі якасцямі і ўчынкамі быць вартымі тытулу, нададзенага праз заслугі продкаў. Шляхецтва, атрыманае па спадчыне без высакароднасці разглядаецца А. Воланам па аналогіі з ценем. У той жа час сама з’ява радавітага шляхецтва не адмаўляецца, увага акцэнтуецца на неабходнасці маральна-інтэлектуальнага выхавання прадстаўнікоў шляхецкага стану [1, с. 35–40].

Важнае значэнне мае разгляд А. Воланам тыпаў дзяржаўна-палітычнага ўладкавання. У адпаведнасці з існуючай традыцыяй, у працы “Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе” сярод іх вылучаюцца манархія, арыстакратыя і дэмакратыя, якія прызнаюцца дапушчальнымі формамі дзяржаўнага ладу пры ўмове забеспячэння вяршэнства права (пры такой умове ў грамадстве забяспечваецца свабода) [1, с. 22]. Сярод адмоўных тыпаў дзяржаўнага ўладкавання вылучаецца тыранія, пра якую ў творах А. Волана размова ідзе некалькі разоў. Пад тыраніяй разумееца, зноў жа ў адпаведнасці з традыцыяй, неабмежаваная ўлада правіцеля, які кіруе дзяржавай не на аснове права, а на аснове ўласнага самавольства. У такой дзяржаве адсутнічае грамадзянская свабода і пануе ўсеагульнае рабства. У якасці

класічнага прыкладу тыраніі разглядаецца Маскоўская дзяржава: “Тыран у Масковіі правіць па сваёй прыхамаці. Законам ён лічыць тое, што захочуць яго распаленыя мазгі. Годнасць і маёмасць жыхароў у той краіне ніяк не абароненыя ад несправядлівасці, якую чыніць самаўладца. У любы момант ён можа не толькі забраць у чалавека ўласнасць, але і сцяць уласніку галаву. Але цёмны і грубы люд, прывучаны да дзікага рабства, не толькі не выступае супроць злачыннай сквапнасці свайго тырана, а ўспрымае яго самавольства і самадурства ледзь не як нябесную кару” [1, с. 46–47]. Але пры гэтым А. Волан папярэджвае, што “правільная” манархія таксама можа выраджацца ў тыранію. Прычынай гэтага можа быць сістэматычнае парушэнне права з боку манаршай асобы [1, с. 24–25].

Што датычыць прыярытэтаў у межах “правільных” тыпаў дзяржаўнага ўладкавання, А. Волан выказваецца асцярожна: “Там, дзе кожная з гэтых формаў дзяржаўнасці захоўвае ўласцівы ёй статус, яна прыносіць грамадзянам шмат дабра і карысці” [1, с. 23].

Ён канстатуе тое, што старажытныя антычныя народы аддавалі першагу дэмакратыі, атаясамліваючы манархію з тыраніяй. Але манархія ў тым выпадку, калі яна абапіраецца на разумныя і справядлівыя законы, можа таксама спрыяць захаванню ў грамадстве свабоды і міру. Прыводзіцца прыклад фарміравання манархічнай улады ў Рэчы Паспалітай: “Перш чым атрымаць стырно кіравання дзяржавай, кароль падчас каранацыі павінен прысягнуць народу і ўрачыста абяцаць, што ніколі і нічога не зробіць насуперак існуючым законам. А калі ён нешта падобнае ўчыніць і яго рашэнні і пастановы парушаць вернасць і святасць прысягі, у такім выпадку яны не будуць лічыцца прававой нормай і не набудуць ніякай юрыдычнай сілы” [1, с. 24–25]. У творы “Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці” акцэнтуецца ўвага на традыцыйных маральных якасцях, што сцвярджаліся ў антычнай і сярэднявечнай этыцы, якім павінен адпавядаць манарх: пабожнасць, справядлівасць і рашучасць у яе адстойванні, мудрасць, шчодрасць, памяркоўнасць, мужнасць [3]. Гэтыя якасці разглядаюцца як сродак забеспячэння дзейнасці манарха ў адпаведнасці з дзяржаўным правам. Прыклады пераўтварэння манархаў у тыранаў, на думку А. Волана, сведчаць не пра заганнасць самога інстытуту манархіі, а пра заганнасць канкрэтных манаршых асоб, якія нядобрасумленна выконваюць свае абавязкі, а таксама дарадцаў манарха, якія не супрацьдзейнічаюць гэтаму [1, с. 24–25].

Дадзеныя разважанні, відавочна, уздзейнічалі на пазіцыю С.А. Падокшына, які сцвярджаў, што манархія, абмежаваная правам, з’яўляецца палітычным ідэалам А. Волана [11, с. 222]. Больш за тое, С.А. Падокшын разважаў наконт прычын адмаўлення А. Воланам арыстакратыі і дэмакратыі як альтэрнатыўных форм дзяржаўнага ўладкавання (бо тыя, як мяркуецца, пільнуюць інтарэсы часткі грамадства – кола выбраных або большасці людзей, але не інтарэсы агульнага дабра) [11, с. 223].

Аднак аналіз твораў А. Волана паказвае, што сітуацыя ў гэтым плане больш складаная. У грамадска-палітычнай думцы Рэчы Паспалітай “чыстая” манархія вельмі рэдка разглядалася ў якасці ўзору. Той дзяржаўна-палітычны лад, які склаўся да сярэдзіны XVI ст. звычайна характарызаваўся як “змешаная манархія”, сутнасцю якой абвяшчалася гарманічнае спалучэнне манархічнага, арыстакратычнага і дэмакратычнага элементаў.

А. Волан станоўча выказваецца пра асаблівасці дзяржаўна-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай. Ён сцвярджае, што ў адпаведнасці з ім прадугледжана ўстанаўленне і змена законаў паводле волі ўсёй шляхты, якая атаясамліваецца з палітычным народам. Гэта разглядаецца як яскравае адлюстраванне палітычнай свабоды, у той час як у іншых дзяржавах устанаўленне законаў з’яўляецца прэрагатывай манархаў або вузкага кола алігархіі, а іншыя грамадзяне не маюць магчымасці ўплываць на гэта (што разглядаецца як кляймо рабства). Таксама А. Волан высока ацэньвае інстытут вольнай элекцыі і крытыкуе спадчынныя манархіі ў іншых дзяржавах (“Манарх сведчыць потым, што ёсць каралём не на аснове спадчыннага права, а з ласкі і адабрэння народа, і ў якасці такога будзе правіць грамадствам”), абмежаванні манарха ў праве абвяшчэння вайны і заключэння міру [1, с. 47–49]. А. Волан указвае на пагрозу, якую нясе з сабой моцная манархічная ўлада: “Патомныя манархі ўспрымаюць сваю ўладу як спадчыну, атрыманую ад продкаў. Таму яны не лічацца з жаданнямі народа і не пытаюцца ў яго згоды. Але галоўная і асноўная прычына разбэшчанага, фанабэрлівага саравання ляжыць у статусе ўладара, калі яго ўлада не абмяжоўваецца ніякімі дастаткова моцнымі цуглямі закону ці калі ён скідае гэтыя цуглі, скарыстаўшыся сваёй падступнасцю ці чужымі крывадушнымі парадамі” [1, с. 48–49]. Зрэшты, С.А. Падокшын таксама разам з раней узгаданымі сцвярджэннямі прызнае, што, паводле А. Волана, шляхта з’яўляецца носьбітам дзяржаўнай улады [11, с. 223]. А ў адной са сваіх апошніх прац ён сцвярджае, што палітычным ідэалам А. Волана з’яўлялася канстытуцыйная манархія, якая абапіраецца на законы [10, с. 133]. Праўда, усе гэтыя тэзісы не абапіраліся на пацвярджэнне з дапамогай аргументаў.

У творы “Прамова да Сената” А. Волан яшчэ больш крытычна ставіцца да прэрагатыў манархічнай улады. Ён выказвае сумненні наконт магчымасці ідэальнага дабрадзейнага манарха, якому б можна было даручыць вялікую ўладу, указваючы на асаблівасці чалавечай прыроды. У якасці негатыўнага прыкладу ўказваюцца марнатраўнасць і іншыя заганы Жыгімонта Аўгуста [2, с. 175–176]. У названым творы А. Волан прапануе цалкам перадаць Сенату і пазбавіць караля права прызначэння на

пасады вышэйшых урарнікаў, забараніць карыстацца без санкцыі Сената каралеўскім скарбам, увесці закон, які б рэгуляваў прыватнае жыццё караля, пад наглядам Сената [2, с. 178-179]. У гэтым кантэксце варта разумець і патрабаванні стварэння вышэйшага апеляцыйнага судовага органу, незалежнага ад каралеўскай улады (на ўзор Парыжскага парламенту ў Францыі або канвентаў у Іспаніі), на што часта ўказвалася ў гістарыяграфіі як на правобраз Трыбуналу ВКЛ, створанага ў 1582 г. [1, с. 99-102; 2, с. 180]. У гэтай сувязі сцвярджаць, што А. Волан з'яўляўся прыхільнікам моцнай манархічнай улады, не адпавядае рэчаіснасці.

Узнікае пытанне, якім чынам А. Воланам разглядалася пытанне аб узаемадзеянні паміж сенатарскай элітай і шляхецкімі масамі, якое мела асаблівую вастрыню ў Польшчы, а потым і ў ВКЛ у 1550–1560-я гг. Тут належыць звярнуць увагу на стаўленне да Сената. У “Прамове да Сената” (якая, на думку С. Падокшына, была складзена на аснове рэальнай прамовы, агучанай хутчэй за ўсё на сумесным соймавым пасяджэнні Сената і Пасольскай ізбы) аўтар звяртаўся да сенатараў са словамі: “Вы ўвасабляеце сабой дзяржаву” [2, с. 174]. Такім чынам, за сенатарскай элітай прызнаваўся статус дзяржаватворчага элементу. Далей у тэксце гэтая ідэя канкрэтызавалася ў сцвярджэнні за Сенатам права і адказнасці за дзейнасць і выхаванне караля. Вышэй гаварылася аб тым, што А. Волан акцэнтаваў правы сенатараў праводзіць прызначэнні на вышэйшыя пасады дзяржаўных урарнікаў, распараджацца каралеўскім скарбам. Таксама ён заклікаў сенатараў да рашучасці ў рэалізацыі сваіх правоў і недапушчальнасці паблажлівага стаўлення да манархаў, якія злоўжываюць сваёй уладай. У гэтым кантэксце указваецца на адказнасць сенатараў за дапушчэнне самавольных дзеянняў, у прыватнасці, у справе марнатраўнага выкарыстання сродкаў з казны папярэднім каралём Жыгімонтам Аўгустам [2, с. 176–177].

Адносна ўладных прэрагатыў шляхты А. Волан, як ужо вышэй адзначалася, высока ацэньваў дзяржаўна-палітычны лад Рэчы Паспалітай з яго шырокімі палітычнымі правамі шляхты. У той жа час ён звяртае ўвагу на тое, што шырокія масы шляхты не маюць належнай адукацыі і выхавання, не заўсёды здольныя скіроўваць свае намаганні ў накірунку агульнага дабра; у сваіх дзеяннях часта кіруюцца прыватнымі, кан'юнктурнымі інтарэсамі. Гэта праяўляецца, напрыклад, у арганізацыі вайсковай абароны: “Шляхта, упадабаўшы бяздзейнасць і даўно адвыкшы ад вайны, не адзываецца на заклікі караля, не бярэцца за зброю і тым самым дазваляе ворагу ўрывацца ў нашыя землі і пустошыць нашу радзіму агнём і мячом” [1, с. 49-50]. Пэўны скепсіс у дачыненні да шляхецкай дэмакратыі прысутнічае ў крытыцы выбараў земскіх суддзяў, якія, паводле словаў А. Волана, не прадугледжваюць ніякай працэдуры і ў якіх рашаючую ролю маюць выкрыкі з натоўпу [1, с. 98]. У сувязі з гэтым дзяржаўны лад Венецыянскай Рэспублікі, у якім важнейшая роля ў кіраванні дзяржавай належыла арыстакратыі, разглядаецца ў якасці ідэальнага і падкрэсліваецца, што там “непасрэдна ўдзельнічаць у дзяржаўных справах могуць нямногія” [1, с. 99]. Такім чынам, хаця А. Волан не адмаўляў права шляхты на ўдзел у ажыццяўленні дзяржаўнай палітыкі, ён выказваў пэўныя перасцярогі адносна перспектывы пануючай ролі шляхты ў палітычнай сістэме і аддаваў перавагу сенатарскай арыстакратыі.

Сярод магнатаў, праўда, А. Волан таксама бачыў тыя ж заганы, што і сярод шырокіх мас шляхты (эгаізм, самавольства, карысталюбства, марнатраўства). Ён асуджаў хцівасць магнатаў, якая праяўлялася ў пагоні за грашовымі прыбыткамі і раскошным ладам жыцця, нават патрабаваў заканадаўчага абмежавання выкарыстання прадметаў раскошы [1, с. 76-80]. Але ў той жа час, можна меркаваць, што сенатарскую арыстакратыю А. Волан бачыў больш падрыхтаванай да ажыццяўлення функцый кіравання дзяржавай. Такая пазіцыя можа быць патлумачана некалькімі фактарамі: цеснымі сувязямі А. Волана з Радзівіламі, падтрымкай Рэфармацыі з боку шматлікіх магнатаў, палітычнымі традыцыямі ВКЛ.

Але неабходна таксама звярнуць увагу на раздзел твора “Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе”, прысвечаны вызначэнню падстаў знатнасці. У ім акцэнтуецца ўвага на інтэлектуальных і маральных якасцях, якія павінны пацвярджаць знатны статус, у супрацьвагу паходжанню. Там жа сцвярджаецца: “Наогул, для дзяржавы надзвычай важна, каб у грамадстве, дзе ўсе станы і людзі ўзаемазалежныя, дзе існуюць розныя інстытуцыі, скіраваныя на карысць чалавеку, існавала і такое саслоўе, якое, грэбуючы ўсімі рамёствамі, старанна займалася толькі тымі справамі, якія садзейнічаюць аўтарытэту дзяржавы і забеспячэнню яе патрэб” [1, с. 44]. Можна меркаваць, што пад такім саслоўем А. Волан меў на ўвазе прафесійную бюракратыю, якая б складалася з асоб, што вызначаліся перадусім сваімі адукаванасцю і кампетэнтнасцю, і якая б у ідэале магла выконваць функцыі арыстакратычнага элементу ў дзяржаўна-палітычнай сістэме. У гэтым жа накірунку бачылася таксама заснаванне апеляцыйнага трыбуналу, у які б змаглі ўвайсці кампетэнтныя прафесійныя юрысты [1, с. 104].

**Заключэнне.** Такім чынам, праблема дзяржаўна-палітычнага ўладкавання вырашалася ў творах Андрэя Волана ў адпаведнасці з сацыяльна-філасофскай традыцыяй, укаранёнай у еўрапейскай грамадскай думцы XVI ст., якая сягала сваімі вытокамі да антычнай спадчыны. У рэчышчы названай традыцыі грамадска-палітычнае жыццё разумелася на аснове маральна-этычных катэгорый (агульнае дабро, справядлівасць, згода). У творах А. Волана змяшчаліся канцэпцыя дзяржавы і права як умовы грамадзянскай свабоды, канцэпцыя станавага падзелу грамадства з прызнаннем адноснай фармальна-прававой

роўнасці прадстаўнікоў усіх станаў, канцэпцыя шляхецтва, акцэнтаваная маральна-інтэлектуальнымі сентэнцыямі. Пры разглядзе пытання формы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання у творах А. Волана змяшчаецца ў цэлым апалагетычнае стаўленне да палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай з падкрэсліваннем асаблівага статусу сенатарскай эліты. Гэта дазваляе сцвярджаць пра падтрымку ідэі "змешанай манархіі" з арыстакратычным ухілам. Характэрнай рысай выступае істотна выражаная інтэлектуалісцкая і прафесіяналісцкая трактоўка арыстакратыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Волан, А. Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе / А. Волан ; пер. з лац. У. Шатон. – Мінск : Змицер Колас, 2009. – 142 с.
2. Волан, А. Прамова да Сената Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага, або Якім павінна быць праўленне дабрачыннага караля / А. Волан // Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын. – Минск : Беларус. навука, 2003. – С. 174–181.
3. Волян, А. Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці / А. Волян // Спадчына. – 1991. – № 6. – С. 95–104.
4. Baliński, M. Pisma historyczne / M. Baliński: w 4 t. – Warszawa : G. Sennewald, 1843. – T. 3. – 213 s.
5. Kurnatowski, O.J. Andrej Wolan: krótki rys życia i pracy znakomitego dzilacza w wieku reformy Kościoła na Litwie / O.J. Kurnatowski. – Wilno : Znicz, 1910. – 24 s.
6. Jarra, E. Andrew Wolan: Sixteenth Century Polish Calvinist Writer and Philosopher of Law / E. Jarra // Studies in Polish and Comparative Law: a symposium of twelve articles ; with a foreword by H.C. Gutteridge. – London : Stevens & Sons, 1945. – P. 124–155.
7. Kempfi, A. Frycz a Wolan. Zapomniana karta recepcji Frycza w Polsce / A. Kempfi // Andrzej Frycz Modrzewski i problemy kultury polskiego Odrodzenia: praca zbiorowa ; pod red. T. Bieńkowskiego. – Wrocław, Warszawa, Kraków, Gdańsk : PAN, 1974. – S. 203–218.
8. Сокол, С.Ф. Политическая и правовая мысль Белоруссии XVI – первой половины XVII вв. / С.Ф. Сокол. – Минск : Наука и техника, 1984. – 188 с.
9. Сокол, С.Ф. Социологическая и политическая мысль в Белоруссии второй половины XVI века / С.Ф. Сокол. – Минск : Наука и техника, 1974. – 144 с.
10. Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын. – Минск: Беларус. навука, 2003. – 316 с.
11. Падокшын, С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі / С.А. Падокшын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 286 с.
12. Саверчанка, І.В. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне іранняе барока / І.В. Саверчанка. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 319 с.
13. Саверчанка, І.В. Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стст. / І.В. Саверчанка. – Мінск : Беларус. думка, 2012. – 463 с.
14. Падалінская, А.А. "Палітыка" Арыстоцеля як падмурак для пабудовы грамадска-палітычных канцэпцый Беларусі ў эпоху Адраджэння / А.А. Падалінская // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. Т. 2. Протарэнесанс і Адраджэнне / С.І. Санько [і інш.] ; Нац. Акад. Беларусі ; Ін-т філасофіі. – Мінск : Бел. навука, 2010. – С. 194–210.

*Паступіў 12.10.2015*

## THE CONCEPT OF STATE-POLITICAL SYSTEM IN THE WORKS OF ANDREI VOLAN

***I. BORTNIK. A. EMELIANAY***

*The problem of state-political system in the works of the outstanding representative of social and political thought of the Grand Duchy of Lithuania XVI century Andrew Volan is considered. The historiography of the problem is examined. Its main achievements and shortcomings are identified. The connection of A. Volan's ideas with the theoretically-categorical system elaborated in the European social and political thought of the Renaissance is revealed. It is noted that in the A. Volan's works the concept of the state and law as a condition of civil liberties, the concept of caste division of society with recognition of the relative formal legal equality of representatives of all the states, the concept of nobility, accentuated the moral and intellectual maxims are placed.*